Сам Слуцак вывозіў шмат тавараў, пераапрацованых у гэтым месьце. Гэта былі вырабы са скуры.

У Магілеў падвозілі тавар рознастайны, але невялічкімі партыямі.

Нарэшце, ідзе яшчэ шэраг местаў, гандляры якіх езьдзілі ў Польшчу: Менск, Бабруйск, Трокі, Пружаны, Навградак, Слонім, Пінск, Кобрын і інш.

Тымі данымі, якія можна здабыць з адрыўкаў мытных кніг, далёка ня вычэрпваюцца зносіны польскіх гарадоў з беларускімі. Рэч у тым, што Берасьцейская мытная акруга абапіралася на 19 мытных пунктаў, сярод якіх Горадня і Дарагічын мелі вялікае значэньне. У выніках сталых звычаяў і адміністрацыйных прадпісаньняў, гандляры розных местаў павінны былі езьдзіць праз той ці іншы пункт. Так, напрыклад, праз Берасьце павінны былі праяжджаць усе тыя, хто ехаў з Валыні. Гандляры з Мазыра і Пінску мелі шлях таксама на Берасьце. Віленцы, якія ехалі ў Люблін, накіроўваліся таксама гэтым шляхам. Але віленцы і горадненцы, якія накіроўваліся ў Варшаву і Гнезна, праяжджалі толькі праз Дарагічын. Лясны тавар і хлеб прыходзіў да Берасьця ракамі Мухаўцом, Бабром і Наровам. Рачны шлях па Прыпяці меў вялікае значэньне, прычым тут важнымі пунктамі былі Давыдгарадок і Пінск. Падляскі горад Бельск меў даволі значныя зносіны з Познаньню, падвозячы на познанскі кірмаш воск.

Кірунак на Кралявец захопліваў Прынёманскі і, пераважна, Віленскі раёны. Сюды тавары перапушчала, галоўным чынам, Ковенская мытніца. Ня дзіва загэтым, што тут плацілі мыта ў большасьці ковенскія-ж гандляры, зразумела, у якасьці пасрэднікаў. Аднак, і віленскія гандляры прымалі тут вельмі значны беспасрэдны ўдзел. Далей, сустракаем гандляроў з Менску, Слуцку, Горадні, Несьвіжу, Мерачы і некаторых іншых местаў. Да гірла Нёмну ішлі часткова тыя-ж тавары, якія пераходзілі праз Берасьце: хлеб у зярне і муцэ, воск, паташ, попел, лён, ільнянае насеньне, гарэхі, скуры ялавічыя (часам сырыя, часам дублёныя), смала, лой.

Але побач з гэтаю грубой сыравінай у Нямеччыну ішлі і вырабы рамяства, таксама найчасьцей грубыя і прымітыўныя. Так, сюды ідуць талеркі (зразумела, драўляныя), лыжкі, нецкі (Netz — сетка), рыбалоўныя прылады ішлі ў вялікім ліку. Віленцы сюды везьлі боты, шапкі; простае мыла правозілася брускамі; паяскі скураныя, пашэўкі да нажоў, коўшыкі чырвоныя маскоўскія, палатно грубое, рагожы.

Побач з віленскімі купцамі вялікую ролю гралі слуцкія. Разам з сыравінаю яны вывозілі яглы, юхць, якая насіла тэхнічную назву слуцкае юхці, палатно простае, хутры вавёрачыя падфарбаваныя, хутры ваўкоў, казьліну, скуры сэрн,

лосяй, жураўлінае пяро. Наогул, вываз Слуцку адзначаецца значным маштабам, орыгінальным і нязвычайным падборам прадметаў вывазу і тым, што гэтыя прадметы маюць характар мясцовае вытворчасьці і гэткімі ў большасьці вядомы ў гандлі. Трэба яшчэ адзначыць, што кожны случанін вёз і некаторую колькасьць пшана,—таксама мясцовая асаблівасьць.

Увоз з Краляўца ня быў такі featuring розностайны, як гэта мы бачылі на Берасьцейскай мытніцы. Бадай што выключна пануе ўвоз солі і селядцоў. Затым сустракаецца медзь, цына, серка, купарвас, цьвікі. Некаторыя тавары далёкага поўдню, альбо цяпер ужо амэрыканскія, сустракаюцца сярод увозу, напрыклад, фігі, кішміш і іншыя.

І ў Коўну вялі старадаўнія і сталыя шляхі. Сюды ішла старая вялікая дарога „з Вільні на Ліду“ і Трокі. Рэчкай Вяльлёй віленцы карысталіся ў летнюю пару і нават досыць рана атрымалі права бязмытнага праезду па баярскіх езах.

У папярэднім выкладаньні ўжо ня раз адзначалася вялікая роля Вільні, як гандлёвага асяродку. Запраўды, гэта быў буйны цэнтр гандлю. Новая Літоўска-Беларуская сталіца ляжала вельмі выгодна ў географічных адносінах і зьвязвала ўсходнюю і заходнюю паловы дзяржавы. З другога боку, яна карысталася вялікімі прывілеямі, бо ўрад імкнуўся трымаць на вышыні дабрабыт гэтага места. Ужо пры Альгердзе мы сустракаем у літоўскай сталіцы гандляроў з Ноўгарада, Пскова, з Рыгі і Масквы, з Краляўца і Гданску, нават з Уладзімера і Львова. Гэткім чынам, тут быў вузел гандлёвых зносін паміж поўднем і поўначчу, захадам і ўсходам. Сюды Гэдымін так няўдала запрашаў хрысьціян усіх вызнаньняў, абяцаў ім рэлігійную вольнасьць, права вольнага гандлю, і асабліва склікаў рамесьнікаў і нават земляробаў. На жаль, мы мала ведаем адносна матар'яльнага росту гэтага места. У 1387 годзе Ягайла даў яму прывілей на Майдэборскае права. Гэта быў першы ў дзяржаве прывілей, які быў дадзены найстарэйшаму гораду. Ён быў пачаткам доўгага шэрагу прывілеяў, якімі карысталіся віленцы. У першай палове XV сталецьця места было звольнена ад мытаў па ўсёй тэрыторыі вялікага княства, яно мае свабоду ад маставых і іншых дробных мытаў, асобны прывілей на бязмытны праезд праз езы па Вяльлі і Нёмну, атрымлівае прывілей на кірмашы, на пабудаваньне гасьцінага двара для чужаземных гандляроў. Віленская ратуша мае выключнае права карыстаньня гарадзкімі вагамі і атрыманьня за гэта асобнае платы, места мае монопольную пастрыгальню суднаў і ваўняных тканін, монополію продажы піва, мёду, хмелю і віна. Яно мае воскабойню, у якой усе павінны былі пераліваць свой воск. У XVI сталецьці, як мы ўжо часткова бачылі, абхват гандлёвых зносін Вільні

Չ4ՒՏԴ



быў вельмі шырокі. Ня толькі віленцы самі езьдзілі ў Маскву, Польшчу і Прусію, але ў Вільню прыяжджалі для гандлю туркі, татары, армяне, маскоўцы, палякі і іншыя госьці. Тут былі склады нямецкіх сукнаў, усходніх дываноў, каштоўных каменьняў. Праз Вільню ў Маскву ішлі косы, срэбра. Шмат маскоўскіх тавараў праходзіла на захад праз рукі віленскіх куццоў. У канцы XVI сталецьця можна адзначыць некалькі буйных гандлёвых дамоў, як дом Мамонічаў, Брука, які гандляваў вэнгерскім віном, Мартына Шлегеля, Сьвірыда Шостака, які правозіў вялікія партыі кос, нажоў, турэцкіх тавараў і інш. Маскоўскія хутры ў XVI сталецьці траплялі галоўным чынам у рукі віленцаў. Гэтыя хутры вельмі цікавілі немцаў, з якіх многія пасяліліся ў Вільні, каб гандляваць хутрамі. Тут-жа, як мы зазначылі, можна было сустрэць і прадстаўнікоў іншых нацый, у тым ліку ангельцаў і шкотляндцаў з іх разносным гандлем дробнага тавару. У канцы XVI сталецьця ў Вільні быў асобны маскоўскі гасьціны двор, які зьдзіўляў чужаземцаў збыткам хутранога тавару. Рака Вяльля часам настолькі запаўнялася суднамі, што яны павінны былі чакаць чаргі, каб увайсьці ў места. І гэта здаралася нават у канцы XVII сталецьця, калі гандаль Вільні ўжо хіліўся да заняпаду.

Зразумела, такі абхват гандлю, як ужо было сказана, падтрымліваўся прывілеямі і тым, што Вільня была асяродзьдзем багатага літоўскага і беларускага шляхоцтва. Трэба памятаць, што ўсе чужаземцы, якія прыяжджалі ў Вільню, павінны былі мець памяшканьне на гасьціным двары. Нават у межах Польшчы віленцы не плацілі падаткаў. Адносна хутраных тавараў гэта давала Вільні права складу, г. зн., права продажы хутраў гуртам і толькі ў Вільні, прычым гандаль паміж прыежджымі гандлярамі забараняўся.

Усёю сваёю гандлёвай і прамысловай конструкцыяй Вільня адрозьнівалася ад іншых местаў.

Віленскі рынак адзначаўся сваім вялікім маштабам. Тут быў галоўны рынак і другарадныя. Гандляры мелі склады тавараў, сьвірны, адкуль яны вывозілі тавары на рынак. Апроч таго, былі звычайныя крамы, склепы, гандлявалі з вазкоў і з „клетак". Клеткі часам займалі і рамесьнікі, дзе яны, відавочна, працавалі і гандлявалі. Для некаторых прадметаў былі асобныя пасажы; напрыклад, памінаецца кушнерскі дом, дзе ішоў гандаль хутрамі, мусіць быць, дробны. Былі і асобныя рынкі для некаторых прадметаў, напрыклад, памінаецца рыбны рынак.

Гандлёвая структура Вільні адзначалася вялікаю складанасьцю. Тут мы сустракаем буйныя хаўрусы гандляроў, якія насілі назову „Гельд" (Гільдыя). Гельды мелі дамы з

202142



вялікімі пры іх складамі і сутарэньнямі. Частка гельд належала да вядомага друкара і выдаўцы Лукаша Мамоніча. Потым гэтая частка гельд перайшла да хаўрусу з 10 чалавек. Адна вялікая гельда належала да таксама вядомага віленскага купца С. І. Азарыча. Такі гандлёвы рост места выявіўся і ў тым, што тут зьявілася першая ўстанова банкаўскага характару з лёмбардным крэдытам, на што выдадзены быў двом яўрэям у 1551 годзе асобны прывілей.

Як відаць, Вільня была ня толькі гандлёвым, але і буйным прамысловым асяродкам для свайго часу,—параўнальна з надта слабым прамысловым разьвіцьцём іншых местаў. Прамысловыя прадпрыемствы належалі ў большасьці самому месту, як, напрыклад, плітніца (каменаломня), млын, цагельні, бровары, пушкарскі завод, г. зн. гісэрня. Каля места былі і некаторыя прыватныя фабрыкі, напрыклад, шкляная фабрыка Пілецкага. Уласьнік гэтае фабрыкі атрымаў прывілей на монапольнае права скупкі ўсяго шкла, якое прывозілі гандляры ў места, відавочна, каб зьнішчыць конкурэнцыю. З монополіі выключана было толькі шкло вэнэцыйскага вырабу.

Гандаль і прамысловасьць, якая нараджалася, прываблівалі да Вільні рабочых. Ужо граматай 1547 году закладаецца ў Вільні біржа працы, адводзіцца асобнае месца, дзе адбываецца найманьне прышлых рабочых.

Гарадзкі ўрад павінен быў наглядаць за тым, каб ніхто ня ўхіляўся ад утварэньня ўмоў з рабочымі ў паказаным месцы каля ратушы.

Згуртаваньне пакупнікоў у Вільні выклікала спэкуляцыйнае падвышэньне цэн. Гэтая акалічнасьць прымушала вышэйшую ўладу прымаць меры да ўрэгуляваньня цэн і да барацьбы з спэкуляцыяй. Так, вызначаўся час, калі перакупнікі могуць купляць харчовыя запасы. Выдаваліся і іншыя распараджэньні, накіраваныя супроць перакупнікаў, калі нават апошнія належалі да ліку панскіх падданых.

Цяпер пяройдзем да Дзьвінскага кірунку. Пунктам, які прыцягваў да сябе гэты кірунак, была Рыга. Аўтар другой паловы XVI сталецьця, Ніенштэдт, паведамляе аб Рызе, што ў гэтым горадзе быў вялікі склад тавараў. Як узімку, так і ўлетку сюды падвозяць усялякага роду хлеб і іншыя тавары. Па Дзьвіне з далёкай Расіі вязуць на плытох, чаўнох і стругох многа вялізных бярвеньняў, будаўнічы лес і дровы, попел, смалу, збожжа, каноплі, лён, скуры, воск, сала, канаплянае масла, канаплянае насеньне і іншыя тавары. А сюды вязуць тавары з Літвы, Курляндыі і Лівоніі. Усе гэтыя тавары прадаюцца ў Рызе, адкуль ідуць за мора. Шмат караблёў з розных месц прывозяць у Рыгу соль, селядцоў, дарагія палотны, шаўковыя тканіны, розныя мэталічныя дробныя

тавары, віно, піва, харчовыя запасы, бакалею, усялякія спэцыі, жалеза, чырвоную медзь, цыну, волава, адным словам, усё, „што толькі патрэбна людзям, усяго прывозяць даволі“. Штогод многія сотні суднаў нагружаюць скурамі і іншымі таварамі. Гэта быў росквіт Рыгі. Яшчэ ў першыя гады XVII сталецьця з Віцебску было адпраўлена 48 стругоў і 8 плытоў, нагружаных таварамі. Усё гэта былі тыя-ж знаёмыя нам продукты.

Галоўнымі беларускімі местамі, якія стаялі на шляху да Рыгі, былі Віцебск і Полацак. Праз гэтыя месты праходзілі тавары болей далёкіх пунктаў: Вільні, Смаленску, Магілева, Воршы, Белага, Тарапца, Вяліжа, Усьвята і іншых. Галоўнымі ўвознымі таварамі тут былі соль і селядцы. Галоўным вывозным яшчэ ў XVI сталецьці быў воск, які потым уступае месца лесу і хлебу. Воск вывозілі цэхаваны, соль увозілі ў торбах. Гэта ёсьць пераважна летнія тавары. Зімнімі таварамі былі: усякае жалеза, патэльні, лемяшы, сякеры, косы.

Праз Полацак праходзілі і маскоўцы на сваіх стругох*), часам з пасажырамі, „прысаднікамі“, з дробным таварам.

Урэшце, Рыскі порт, як і ў болей даўнюю эпоху, адзначаўся тым, што рыскія гандляры стараліся эксплёатаваць беларускіх і ўтваралі шэраг перашкод, рабілі ўціскі...

У пачатку XVII сталецьця палачане скардзіліся, што рыжане парушаюць старыя прывілеі, самі са сваімі таварамі праяжджаюць міма Полацку, у самой Рызе бяруць „незвыклые податки и мыта“, ужываюць няправільную вагу. Бракаваньне тавараў несправядлівае. З другога боку палачане і віцябляне зацягвалі выплату запазычанасьці рыжанам. У 1701 годзе каралеўскі камісар Рыбінскі зьявіўся ў Віцебск з 1000 чал. саксонскае пяхоты для спагнаньня запазычанасьці з віцяблян, але наогул мы сустракаем болей скарг на рыскія парадкі.

У пачатку XVIII сталецьця аб Рызе існавала зданьне, як аб месьце „зусім бяспраўным, якое ня ведае ніякага іншага закону, апроч хітрых маккіавельлеўскіх штук на шкоду для чалавецтва“.

Трэба, урэшце, заўважыць, што няйвялікшы росквіт рыскага гандлю належыць да XVI сталецьця, а ў XVII сталецьці з пераходам яе пад уладу швэдаў, паўстае так многа

*) Па Дзьвіне хадзілі судны розных назоў. У даўнейшыя часы памінаюцца „учаны“—судны вялікага тыпу. З XVI сталецьця памінаюцца стругі, ладзьдзі (чаўны) і плыты, часам поўстругі і шкуны. Найболей ужываным тыпам былі стругі, лайбы, якія падымалі да 12 тысяч пудоў. Правядзеньне іх па парогах патрабавала вялікае спрытнасьці, дзеля чаго на Дзьвіне былі асобныя лоцманы, якія самі ўладалі стругамі альбо наймаліся праводзіць чужыя стругі. Каштаваў струг 300 коп грошай.

труднасьцяй, што яны перашкаджалі правільнаму гандлю. Зразумела, гэтаму дапамагаў і агульны заняпад вытворчасьці суседняе Беларусі.

Нашыя веды аб увозе і вывазе па іншых мытніцах значна слабейшыя.

Захавалася мытная кніга па Віцебскай мытніцы за цэлы 1605 год. Віцебск ляжаў на раздарожжы. Праз яго праходзілі ня толькі тавары, накіраваныя ў самае места альбо з места ў Рыгу, але яго мытніца адзначала і транзітны тавар, які ішоў з Масквы ў Рыгу, Магілеў, Вільню. Перавод на якую-колечы азначаную адзінку ўсіх прапушчаных праз Віцебск тавараў ёсьць справа немагчымая. Дзеля гэтага прыходзіцца прыблізна судзіць аб колькасьці тавараў па сродках перавозу.

Наагул, гэта ёсьць пэрыод заняпаду віцебскага гандлю. Ня дзіва загэтым, што ў самае места ўвайшло адносна нямного тавараў на 36 падводах, 2 стругох, 2 поўстругох і 5 чаўнох, прытым пераважна рыначнага тавару (мёд, рыба) і радзей вывознага (пянька, скуры). Места Віцебск адпусьціла 42 падводы, 3 чаўны, 1 струг і 1 поўструг у розныя месты. Сярод гэтага вывазу даволі многа скуранога тавару пайшло ў Менск. Апроч таго, праз Віцебск у Рыгу і Полацак прайшоў буйны тавар, у тым ліку панскі (відавочна, ня ўвесь падлічаны мытніцай): 43 стругі, 7 плытоў, 2 чаўны і 3 падводы з ляснымі таварамі, скураным таварам, пянькой, ільняным і канапляным насеньнем і хлебным зярном. Гэта і ёсьць запраўдны закардонны вываз Віцебскае акругі. Памер яго, як бачым, даволі нязначны.

Але, апроч таго, Віцебская мытніца прапусьціла значную партыю маскоўскага тавару з места Белага,—16 стругоў, 2 поўстругі і 14 падвод. Гэта ўсё скураны тавар, часткова хутраны і маскоўскія вырабы: — рукавіцы, палатно, сярмягі, мыла.

Нарэшце, запісы Віцебскае мытніцы сьведчаць аб тым, што Віцебск быў буйным складачным пунктам скуранога тавару, часткова хутранога: 25 падвод гэтага тавару прайшло ў Магілеў. Хутры простыя, часткова маскоўскія, часткова, відавочна, беларускія (ваўкі, выдры, куніцы). Гуртаваньне хутранога тавару ў Магілеве наводзіць на думку, што ён там апрацоўваўся і падрыхтоўваўся для закардоннага экспорту.

У Вільню, як і ў Менск, ішоў пераважна скураны тавар (26 падвод, 1 струг, 2 поўстругі, 2 чаўны).

Па Ковенскай мытніцы ёсьць адрывак мытнае кнігі за красавік-май канца XVI сталецьця. Панскі тавар не рэгістраваўся на мытніцы. Загэтым галоўнага вывазу азначыць

немагчыма, а ў Кралявец ішлі галоўным чынам хлеб і лес. Астатні двохмесячны вываз грубых тавараў можна было-б забраць у вадзін таварны цягнік. Увоз даваў галоўным чынам соль, якой увезена ня меней за 70.000 пудоў за два вясеньнія месяцы. Адносна далейшай эпохі нашыя веды аб вывазе таксама не адзначаюцца багацьцем і дакладнасьцю. Мы ведаем, што Гданскі гандаль, які абслугоўваў галоўным чынам Польшчу, яшчэ рабіў значны водпуск хлебу да паловы XVII сталецьця, але потым пачынаецца хуткі заняпад яго. Ужо ў пачатку XVIII сталецьця вываз Гданску, згодна вестак, якія дае Корзон, часам падае да 2-3 тысяч лаштаў у год, г. зн. у 50-60 разоў меней за вываз паловы XVII сталецьця. (Урэшце, каля паловы XVIII сталецьця вываз Гданску падняўся, але ніколі ён не даходзіў да пэрыоду росквіту гданскага гандлю). Праз Кралявец у 1750—1780-х гадох у сярэднім праходзіла каля 17.000 лаштаў чатырох найважнейшых хлябоў. Вываз Краляўца гэтае эпохі ўдвойчы меншы за адначасны вываз Гданску. Але, зразумела, у гэтым вывазе рашучая перавага была з боку Беларусі і Літвы. Калі судзіць па захаваўшыхся даных 1792 году, дык доля Літвы і Беларусі складала прыблізна $^3/_4$ агульнага вывазу.

Цэнтральная і ўсходняя Беларусь вывозілі свае тавары яшчэ праз Лібаву і Рыгу. На думку Корзона, Літва і Беларусь вывозілі праз гэтыя порты агулам на 14-19 мільёнаў злотых польскіх, у тым ліку на 3-4 мільёны злотых польскіх хлебу, г. зн. каля 11.000 лаштаў. Гэта вельмі прыблізны падлік. У кожным разе ясна, што ў вывазе пачынае пераважваць ня хлебны продукт, але лён, каноплі, пакульле. Водпуск лясных тавараў, жывёлы і скур ня граў ужо вялікае ролі.

Мала таго, вываз у значнай меры зьмяніў свой характар параўнальна з XVI сталецьцем у тым сэнсе, што раней мы бачылі спробы, і параўнальна даволі значныя, вывозіць некатарыя, хаця і грубыя, але ўсё-ткі апрацаваныя вырабы,—скураныя, ніцяныя і інш. Цяпер гэтыя прадметы зусім зьнікаюць з ліку прадметаў вывазу, калі ня лічыць некаторых апрацаваных вырабаў не мясцовае вытворчасьці, якія перасылаліся ў Расію. Гэта значыць, што некаторыя галіны мясцовае прамысловасьці, якія нараджаліся ў XVI сталецьці, з цягам часу заняпалі, не атрымаўшы разьвіцьця.

Як мы бачылі, Полацак і Віцебск былі местамі, праз якія праходзілі тавары іншых местаў. Але і самі полацкія і віцебскія гандляры прымалі жывы ўдзел у гандлі. Бліжэйшы раён Падзьвіньня быў раёнам, куды ехалі гандляры з Полацку (у Вяжышчы, Бешанковічы, Улу, Чашнікі, Копцевічы

і інш.) і скуплялі тут у сялян тавары. Гэтаму-ж дапамагаў і Віцебскі кірмаш.

Пакуль Смаленск быў пад уладай літоўска-беларускага князя, ён таксама прымаў удзел у рыскім гандлі. Маскоўскія купцы і ў пазьнейшыя часы хадзілі з Масквы ў Рыгу праз Дарагабуж і Смаленск.

Найбуйнейшым пунктам гандлю верхняга Падняпроўя з цягам часу зрабіўся Магілеў. Яго гандляры вялі даволі шырокія гандлёвыя зносіны. Мы бачылі, што Магілеўскія гандляры гандлявалі з Рыгай, Смаленскам, Віцебскам, бывалі ў Вільні, Менску, Кіеве, Жытоміры, Слуцку. Магілеўскія гандляры ахвоча езьдзілі ў чужыя краіны. У Люблін яны езьдзілі на тамашнія кірмашы 28 кастрычніка альбо 2 лютага. Адтуль яны прывозілі мануфактурныя альбо колёніяльныя тавары. Яны бывалі ў Таруні, Гданску, Гнезьне, Краляўцы, Львове. Яны прабіраліся ў Маскву, а праз Смаленск таксама атрымлівалі маскоўскія хутры. Магілеўскае насельніцтва часта хадзіла на рыбныя промыслы на Украіну. Яны праз Кіеў хадзілі ў Канеў, Чаркасы, у Падолію і на Валынь. Усё гэта сьведчыць аб далёкім і шырокім кругу зносін.

Але, апроч таго, Магілеўскія гандляры з рэдкай энэргіяй будзілі мясцовы рынак. У мястэчках і сёлах Падняпроўя яны скуплялі пяньку, сала, лой, мёд прэсны, хлеб і, відавочна, тут-жа прадавалі далёкія прывозныя тавары. Можна адзначыць вельмі шырокую акругу, дзе ўсталіўся магілеўскі скупнік: Копысь, Мсьціслаў, Крычаў, Прапойск, Рэчыца і нават Гомель, Ворша, Шклоў, Галоўчына, Бялынічы, Лукомль, Смаляны, Талачын, Глыбокае, Данілавічы і іншыя. Докумэнты, якія характарызуюць быт магілеўскіх гандляроў, пацьвярджаюць цесную сувязь іх з закардонным рынкам. Напрыклад, у пераліку прадметаў хатняга ўжытку пераважваюць рэчы, зробленыя і апрацаваныя з прывознага закардоннага матар'ялу, напрыклад: кашулі з коленскага палатна, расшытага шоўкам, альбо з палатна голяндзкага, швабскага, маскоўскага, адзеньне з сукна люнскага і іншых гатункаў, аксаміту і каразеі. Многа ўжывалася сукно мураўскае. Адзеньне падбівалася маскоўскімі хутрамі. Анталяжы ўжываліся голяндзкія. Нават простыя кажухі са скуры барана мелі каўнер, расшыты шаўковаю чырвонаю крайкай. І гэта адзеньне не заможнае клясы, а сярэдняга мяшчанства. Нават бедная мяшчанка з прадмесьця сярод адказаных ёй у тэстамэнце манаткаў мае ўсё-ж такі „сукман лионский синий“.

Сьпісы тавараў, што паступалі на Магілеўскі рынак, таксама паказваюць, што ў крамах гэтага места можна было

знайсьці ўсе закардонныя тавары, якія прыходзілі на Беларусь праз Польшчу, з Прыбалтыкі і з Масквы.

Да вышэйпрыведзенага агляду гандлю нам трэба дадаць яшчэ некалькі характарыстычных штрыхоў. Нам ужо прыходзілася зварочваць увагу на тое, што гандляры буйных гандлёвых местаў шырака захоплівалі дробныя рынкі, скупку па мястэчках і сёлах. Можна нават намеціць некаторую спэцыялізацыю ў тых мясцовасьцях, рынак якіх рабіўся слынным падвозам тых ці іншых тавараў. Вось некалькі прыкладаў: у Менск аколічныя жыхары звозілі для продажы хлеб. Тыя-ж крыніцы кажуць аб Чорнабылі, Мозыры, Пінску і Мерачы. У Мозыр-жа на рынак звозілі мёд, прыводзілі жывёлу. Магілеў быў вядомы як рынак „зверя косматого“, коняй і скур. У Мсьціслаў суседнія сяляне прыводзілі буйную і дробную жывёлу і прывозілі мёд прэсны. Рэчыца была рынкам продажы коняй.

Але наогул рынак складаўся з нямногіх тавараў, разьлічаных на далёкі збыт, і з рознастайнага сялянскага тавару, які везьлі на мясцовыя рынкі. Вось, напрыклад, сьпіс прадметаў, якія падвозіліся на рынак Магілева і абкладаліся магілеўскім магістратам: мёд, лой, саланіна, замарожаная рыба (вазамі), салёная рыба (бочкамі), яблыкі (вазамі), гарэхі (вазамі), пшано, жывыя і бітыя сьвіньні, скуры, жывёла, хмель, воск, рагожы, кара і луб, сена, бярвеньні і іншы лясны матар‘ял; прыносілі нават пляцёнкі дроў, драўлянае начыньне, смалу, дзёгаць, попел. Гэткім чынам, мясцовы рынак складаўся з самае рознастайнае сялянскае сыравіны.

Пакуль воск меў вялікае значэньне ў гандлі, дык яшчэ ў XVI сталецьці існавалі воскабойні, г. зн. прамысловыя заклады, дзе воск абчышчаўся, штампаваўся ў асобныя кругі і „цэхаваўся“, г. зн. на ім клалі штэмпаль. Тут-жа адбывалася дзяржаўная скупка воску і спагнаньне з яго мытаў. Такія воскабойні былі ў Наваградку, Менску, Берасьці, Вільні, Полацку, Валкавыску, нават у такім маленькім мястэчку, як Пяшчатка. Былі воскабойні і ў іншых мясцох, напрыклад, у Бельску. За кардон вываз воску адбываўся галоўным чынам праз Ковенскую васковую камору. Аб маштабе вывазу воску можна судзіць па тым, што ў 20-х гадох XVI сталецьця праз ковенскую мытніцу праходзіла каля 1½ тысяч пудоў, г. зн. 1½ вагона ў год. На першым месцы стаяла віленская васковая камора, праз якую ў тыя-ж гады праходзіла каля 15 тысяч пудоў. Праз Полацак праходзіла каля 2.100 пудоў. Гандаль воскам, урэшце, у XVI сталецьці падае. Па захаваных справаздачах аб зборах васковага мыта можна бачыць гэты паступовы заняпад у

другой полове XVI сталецьця, а ў самым пачатку XVII сталецьця вываз воску зьменшыўся ў $2^1/_2$ разы параўнальна з паловай XVI сталецьця.

Гандаль ня быў вольны. Ён сустракаў шэраг перашкод ува ўрадавай політыцы, якая імкнулася выкарыстаць гандаль для павялічэньня прыбыткаў скарбу. Мяшчанскі гандаль быў сьціснуты прывілеямі шляхоцтва. Нарэшце, постановы ратуш і самых гандлёвых таварыстваў мелі тэндэнцыю накладаць тыя ці іншыя забароны на гандаль. Яшчэ ў XVII сталецьці панаваў пагляд на гандаль, як на заняткі асобнага цэху. У Вільні і Магілеве, а, мусіць быць, і ў многіх іншых местах гандляры ўтварылі адзіную гарадзкую грамаду, гандлярскае брацтва, з мэтаю ўпарадкаваньня гандлю. Адпаведная пастанова, як на прычыну ўтварэньня брацтва, паказвае на тое, што ў места прыходзяць розныя людзі і займаюцца гандлем, ня прыносячы карысьці ні гандляром, ні месту, г. зн., іншымі словамі, аб'яднаньне гандляроў мае на мэце барацьбу з гандлярамі іншых местаў. У гандлярскую асоцыяцыю ўваходзяць толькі тыя асобы, якія запісаліся ў гандлярскі рэестр, унесьлі ў брацкую скрынку ўклад у 2 капы грошай і далі прысягу. Для гандляроў іншых местаў уступ у брацтва затруднёны быў тым, што гэтыя гандляры павінны былі спачатку давесьці сваё „почтивое“ пахаджэньне, раней упісацца ў мяшчанскі рэестр, а потым ужо прасіць аб запісе ў гандлярскі рэестр. У гэтае брацтва, як відаць, уваходзяць больш-менш буйныя гандляры, якія гандлююць прывознымі таварамі. Купецкая грамада мае звычайны тып брацтва, цэху, яна мае свой дом, і яму надана магістратам права рэгуляваньня гандлю. Існаваў і інстытут гандлярскага вучнёўства, які складаўся перш за ўсё з сыноў гандлярскіх, а потым з прыкашчыкаў, якіх рэкомэндавалі іхныя гаспадары.

Гэткім чынам, у той пэрыод, калі ў Эўропе гандаль вызваляўся ад сярэднявечных інстытуцый, у нас гэтыя інстытуцыі мелі поўную сілу. Цэлы шэраг пастаноў накіраваны супроць вольнае конкурэнцыі. Статуты тых цэхаў, якія мелі сувязь з закупам сыравіны на рынку, у сваіх пастановах і праз свае органы змагаліся з тымі, якія купляюць раней за цэхавых братоў, не на рынку, ня ў пэўныя гадзіны і г. д. Так рабілі магілеўскія саладоўнікі. Магілеўскія рэзьнікі ўстанавілі парадак скупкі мяса і жывёлы, якую прыводзілі ў Магілеў. Яны ня толькі не дапушчаюць перакупнікаў, але ўстанаўляюць і роўнамерную закупку сябрамі цэху.

Рыбныя гандляры Магілева, каб унікнуць конкурэнцыі ў закупцы сушанае рыбы, якая прывозілася ў Магілеў вялікімі партыямі, зрабілі паміж сабою наступную згоду: камісія ў складзе 4-х гандляроў аглядае прывезеную рыбу,

вядзе перамаўленьні з гандлярамі, якія прывезьлі яе, закупляе, і купленая гэткім чынам рыба дзеліцца паміж усіх гандляроў. Дробныя закупкі можа рабіць кожны гандляр. Гэтая пастанова не датычыць паспалітых людзей, якія могуць гуртам і ў розьніцу купляць прывезеную „гасьцямі“ рыбу.

Часам сам урад, у буйнейшым маштабе, дапамагае ўтварэньню асоцыяцый гандляроў для скупкі таго ці іншага продукту, напрыклад, для скупкі збожжа.

Гандлярскія асоцыяцыі выступалі часам на болей шырокі шлях у справе ўпарадкаваньня гандлю. Напрыклад, магілеўскія купцы ў 1698 годзе пастанавілі на год спыніць гандлёвыя зносіны з Прусіяй і Масквой, з прычыны рабункаў, якія адбываюцца ў межах Беларусі. Грамады гандляроў выступалі на абарону сваіх інтарэсаў і г. д. Але голас мелі толькі гандляры буйных местаў, хаця нават права на Майдэборскі парадак не заўсёды яго забясьпечвала.

Гандляры дробных местаў, асабліва тых, якія знаходзіліся ў прыватных уладаньнях, падлягалі цалкам уладзе старастаў. Ня гледзячы на фармальнае існаваньне Майдэборскага права, гандаль знаходзіўся ў надта ўціснутым становішчы. Праўда, гэта быў дробны мясцовы гандаль, але стараста імкнецца выжаць з яго столькі сокаў, што гандальня можа мець шырокага разьвіцьця і беспасрэднае сувязі з гандлёвымі асяродкамі. Напрыклад, у ратушных кнігах гораду Крычава ў палове XVIII сталецьця быў запісаны загад старасты такога зьместу:

Гандаль у Крычаве дазваляўся па пятніцах і нядзелях. На рынак прывозіліся пянька, воск, сьвечнае сала і іншыя тавары. Экономія абяцае купляць гэтыя тавары для экономіі па тэй цане, па якой будуць плаціць чужыя гандляры. Але ўвесь кароткі загад накіраваны супроць чужых гандляроў. Усе тавары, купленыя ў местах Крычаўскага староства, ня могуць быць вывезены за межы староства і абавязкова павінны быць прададзены толькі ў экономію. Мясцовым гандляром дазваляецца езьдзіць у некаторыя суседнія мястэчкі, у іншыя езьдзіць забараняецца пад пагрозай цяжкае астрожнае няволі. Але купленыя ў іншых мястэчках тавары прадаюцца ў Крычаве па тэй-жа цане, якая ўстанаўляецца ў Крычаве для аналёгічных тавараў мясцовае вытворчасьці.

І гэтае зьявішча не выпадковае. Хцівасьць шляхты і цяжкое грашовае становішча дзяржавы давілі на гандаль, трымалі яго ў ланцугох сярэднявечча і дапамагалі яго паступоваму заняпаду.

Гарадзкі гандаль знаходзіў сабе моцнага конкурэнта ў шляхоцкім гандлі, які быў бадай што звольнены ад мытаў.

Шляхта не плаціла мытаў за тавары, за продаж выра-

баў сваёй вытворчасьці, а таксама бязмытна ўвозіла чужаземныя тавары „на сваю потребу“, прычым патрэба гэтая разумелася шырака. Да некаторай ступені можна судзіць аб удзеле шляхты ў гандлі па захаваўшыхся ад канца XVI сталецьця вестках аб разьмеры бязмытнага пропуску шляхоцкіх тавараў. Наогул, шляхта ўвозіла і вывозіла тавараў у 5 раз меней, чымся гарадзкія гандляры. Але трэба зрабіць папраўку ў тым сэнсе, што шляхта плаціла мыта за тыя-ж тавары, якія яна ўвозіла звыш свае патрэбы.

Паказаныя суадносіны даюць некаторае паняцьце аб адносным маштабе таго і другога гандлю. Мала таго, калі ўзяць мытныя акругі, дык выяўляецца, што там, дзе быў больш разьвіты не шляхоцкі гандаль, там доля шляхоцкіх тавараў была меншая. Напрыклад, у Віленскім і Менскім раёнах шляхта правозіла толькі 1/8 тавараў, а ў Горадзенскім адну пятую. Наадварот, у Віцебскім раёне яна правезла трэцюю частку тавараў.

Гандлёвыя транспорты шляхты, асабліва па вывазе, адзначаюцца буйнейшым маштабам. Наадварот, горадзкі гандаль наогул—дробны гандаль. Ён мае ўсе характэрныя рысы сярэднявечча. Сам гандляр асабіста едзе з таварам і па тавар. Гэта ёсьць гандляр рамесьнік. Нават такі буйны прадстаўнік гандлю, уласьнік друкарні, уласьнік гельды, як Ян Мамоніч, на шасьцёх вазох асабіста вязе свой тавар з Любліну. У гандлі пераважвае самотны гандляр, таварыстваў няма, апроч выключна рэдкіх выпадкаў.

Гандлёвы зварот ня мог быць шпаркім з прычыны цяжкасьці ўмоў перавозу тавараў. Нават на пераезд з Берасьця ў Люблін і назад патрабавалася два тыдні. Падарож з Берасьця ў Познань рабілі ў тры тыдні. Але Берасьце знаходзілася на мяжы дзяржавы. Гандляры лічылі лепшымі зімнія падарожы, што тлумачыцца і часам кірмашоў Люблінскага, Познанскага, Лейпцыгскага, і тым, што везьлі параўнальна лёгкі тавар. Буйны гандляр праяжджаў зімой, а дробны працаваў і ўлетку. Некатарыя з дробных гандляроў вельмі інтэнсыўна падвозілі тавары, зьяўляючыся, напрыклад, на Берасьцейскай мытніцы некалькі раз адзін за адным кожныя два тыдні.

Працэс скупкі тавараў быў нялёгкі. Каб сабраць транспорт у 450 юхцяй і 500 іншых скур і хутраў, г. зн. усяго на 2-3 вазы, два гандляры скуплялі гэты тавар у дзесяцёх розных асоб, прычым цэнтрам скупкі былі далёкія месты—Магілеў, Ворша, Мсьціслаў, Быхаў. Каб перакінуць гэтую партыю тавару ў Слуцак, адтуль у Берасьце і Люблін, патрабаваўся ўдзел многіх асоб і, зразумела, шмат часу.

Трэба адзначыць яшчэ адну важную акалічнасьць, што

ўласна з беларускага боку гэты гандаль быў найболей актыўны, бо самі беларускія гандляры выяжджалі за кардон. Польскія гандляры рэдка зьяўляліся ў Берасьці. Яшчэ радзей прыяжджалі немцы з Балтыцкіх партоў.

У гэтым гандлі крэдыт, як відаць, граў вельмі малую ролю. Форма пісьмовага вэксалю мала ўжывалася. Толькі сярод яўрэйскіх гандляроў памінаюцца пазычальныя лісты. Акт пазыкі проста абвяшчаўся перад войтаўскім радам. Цяжка сказаць што-колечы аб вышыні процанту. Ён не памінаўся ў заявах, праўдападобна, таму, што „гостинец“ альбо процант далучаўся да капіталу, які павінен быў быць зварочаны. Процант, як відаць, ня быў нізкім. Пазыкі былі дробныя. Аб труднасьці здабываньня грошай у крэдыт можна судзіць па тым, як нялёгка было дзяржаве ў гады лівонскае вайны знаходзіць грошы нават пад заставу вялікакняскіх добраў.

**8. Заключныя ўвагі і эпоха падзелаў.**

На папярэдніх старонках намі ня раз вызначаліся тыя нездаровыя зьявішчы, якія ўкараняліся ў экономічным і соцыяльным строі Беларусі. Паасобку адзначаўся заняпад тэмпу экономічнага жыцьця ў XVII і XVIII сталецьцях пасьля кароткага яго росквіту ў XV сталецьці. Становішча знадворнага гандлю складалася неспагадна.

Вытворчасьць краіны з ростам насельніцтва і па меры захопу земляробствам усё большае і большае колькасьці незанятых абшараў не перабудоўвалася і краіна ня выходзіла з стану вытворцы найгрубейшае сыравіны.

Аб прамысловасьці апрацоўчай, за выключэньнем млыннае справы, бадай што нельга казаць, бо толькі дзе-ні-дзе мы бачылі нязначныя сьляды яе. Яна і не магла ўтварацца ў такіх умовах, калі нават напярэдадні падзелу цэхавы строй меў поўную сілу і мог давіць на фабрыку, якая толькі нараджалася.

Мы павінны прызнаць факт зьбядненьня дзяржавы. Перш за ўсё гэта выяўляецца ў зьбядненьні сялянскае клясы. Яго становішча надта цяжкое. Краіна, у якой самая шматлікавая кляса знаходзіцца ў стане зьбядненьня і бяспраўя, нічога ня робіць для рынку, за выключэньнем покупу солі і гарэлкі, ня мае патрэб і ня можа іх разьвіваць.

Гарадзкая кляса існавала формальна. Местаў было шмат, але, апроч нямногіх, яны былі бедныя насельніцтвам. Як відаць, лік яго ў XVIII сталецьці не павялічыўся, а нават зьменшыўся параўнальна з XVI сталецьцем. Аб дробных мястэчках бадай што ня прыходзіцца гаварыць. Сярод некалькіх хат стаяць карчмы, прад якімі ў азначаныя дні прадаюць сіты, мётлы і гаршчкі. Вось тыповы малюнак поль-

ска-беларускага гораду ў XVIII сталецьці. Пышныя Майдэборскія прывілеі не збаўляюць гарадзкіх жыхароў ад націску з боку шляхты.

Чалавек, на поясе якога вісела шабля, панаваў над усёй гэтай бяспраўнай масай сялян і мяшчан. Але шляхціц у масе таксама быў бедны. Правільней на яго трэба глядзець, як на прадстаўніка болей заможнага сялянства. І толькі невялічкая група вяльможных паноў фактычна панавала над усёю астатняю масай. Толькі двор буйнога і сярэдняга пана меў зносіны са знадворным сьветам, карыстаўся чужаземнымі вырабамі і сам зьяўляўся буйным экспортэрам. Гарадзкі гандляр толькі выпадкова, як квотнік або комісіянэр, мог прыняць удзел у панскім вывазе. Затое ён дастаўляў на панскі двор чужаземныя вырабы. Але дзеля таго, што дзяржава патрабавала бязупынна грошы і падымала мытныя стаўкі, дык увесь цяжар мытных збораў ляжаў на гарадзкім гандляры.

Ня гледзячы на ўсю перавагу свайго становішча, шляхта ўсё-ткі з зайздрасьцю глядзела на наймалейшыя праявы заможнасьці ў гарадзкой клясе і шляхам закону змагалася з яе выяўленьнем. Многім аўтарам XVIII сталецьця гандлёвая кляса здавалася багатай. Канстытуцыі першае паловы XVII сталецьця нават забараняюць мяшчанам насіць шаўковыя адзеньні, дарагія хутры і інш.,—адным словам, яны накірованы супроць пышнасьці гарадзкое буржуазіі.

У гандлёвай політыцы сярод многіх іншых мер трэба адзначыць моцна ўсталяваную політыку цьвёрдых цэн. Яна адносіцца яшчэ да паловы XVI сталецьця, калі яна выклікалася патрэбаю рэгуляваць цэны, па якіх войска магло купляць провіянт.

У XVII сталецьці гэта ёсьць ужо зьявішча, якое руйнавальна ўплывала на гандаль і на ўвесь экономічны лад краіны. Цьвёрдыя цэны набываюць характар сталы і строга праводзяцца. Віленскія гандляры ў пачатку XVII сталецьця скардзіліся паном—радзе на тое, што таксы руйнуюць месты і гандаль: людзі павінны спосабам свайго жыцьця зрабіцца гуннамі ці вандаламі, альбо эміграваць ці ўцячы ў казакі. Канстытуцыі другое паловы XVII сталецьця ішлі далей: яны патрабавалі, каб гандляры за чужаземныя тавары бралі ад 3% да 7% прыбытку ў залежнасьці ад пахаджэньня гандляра. Так, яўрэі мелі права браць толькі 3% прыбытку, гандляры іншых местаў—5%, а гандляры тутэйшага краю—7%. Праўда, соймы 2-ое паловы XVIII сталецьця пачынаюць разумець патрэбу падтрыманьня гандлю, але меры, якія прымаліся соймамі, мелі часам якраз адваротнае значэньне. Толькі ў мытнай політыцы зроблена была паважная зьмена.

Так, конвокацыйны сойм 1764 году скасаваў мытныя прывілеі шляхты, устанавіў адно „генэральнае“ мыта і даручыў скарбовым камісіям, якія ён-жа заклаў, клапаціцца аб гандлі, мануфактурах, мерах, вэксалёх і інш. Гэтыя меры былі пацьверджаны соймам 1775 году. Гэты зварот мытнае політыкі зьнішчаў самую галоўную перашкоду для разьвіцьця гандлю.

Але адносна разьвіцьця прамысловасьці соймавыя констытуцыі адышлі недалёка ад паглядаў сярэднявечча. У тэй-жа 2-ой палове XVIII сталецьця соймы неаднакроць выдаюць пастановы, накіраваныя супроць пышнасьці нешляхоцкіх станаў. Наадварот, адносна местаў соймавая політыка нярэдка зьяўлялася шкоднай. Констытуцыя 1762 году дае шэраг амаль поліцэйскіх наказаў і некаторыя дробныя палёгкі гарадзкім жыхаром. Гэтая констытуцыя на практыцы вялікага значэньня ня мела, тым больш, што констытуцыя 1768 году аддала мяшчан пад уладу стараст як у пытаньнях адміністрацыйных, так і судовых. Гэта быў зварот даволі нечаканы—даручэньне ваўком апякаць авец, як кажа адзін дасьледчык. На старасту можна было скардзіцца асэсарскаму суду. Але гэта было справай нялёгкай, бо старасты хапалі і садзілі пад арышт тых, хто скардзіўся. Пачалася ўпартая вайна між старастамі і мяшчанамі, якая скончылася перамогай старастаў над местамі. Констытуцыя 1776 году, установленая толькі для Літвы і Беларусі, зусім зьнішчыла Майдэборскае права для местаў і мястэчак гэтае часткі рэспублікі, захаваўшы Майдэборскае права толькі ў наступных 10 местах: у Вільні, Лідзе, Троках, Навагрудку, Ваўкавыску, Пінску, Менску, Мозыры, Берасьці і Горадні. Констытуцыйны акт тлумачыць гэтую меру тым, што іншыя месты і мястэчкі зьяўляюцца, сьцісла кажучы, земляробскімі селішчамі, і тым, што гарадзкія суды робяцца неадпаведнымі па падрыхтоўцы элемэнтамі. Гэтая мера выклікала выбух абурэньня ў розных колах і шэраг рэзкіх выступаў у друку. Брошуры таго часу адзначаюць, што з 1768 году пачаўся пэрыод гібелі местаў. Адзін анонімны аўтар апавядае, быццам каля 3.000 мяшчан выселілася ў Расію і Прусію.

Гэткім чынам, заняпад гаспадаркі местаў яшчэ болей быў падкрэсьлены эгоістычнай політыкай шляхты.

Орыгінальна, што ў гады росквіту мэркантылізму ні ў Польшчы, ні ў Літве не адчуваецца зьяўленьня новых кірункаў у галіне гандлёвае політыкі. Пануе ранейшы сярэднявечны варожы пагляд на гандляра. Гандаль зьяўляецца пагарджанаю справай.

Сярод іншых прычын, якія адмоўна ўплывалі на гандаль, трэба адзначыць дрэнны стан шляхоў. Тэорэтычна соймавыя

констытуцыі выяўлялі клопат аб пабудаваньні мастоў, грэбель і інш. Але, калі пасьля далучэньня Беларусі да Расіі, зьявіліся ў нашым краі паштовыя шляхі, дык адзін з сучасьнікаў пісаў: „Хто ведаў край Беларускі да пераходу яго ў межы Расіі? Ён бачыў там дарогі вузкія, імшарыстыя, камяністыя, блытаныя, дзе сустракаліся тысячы небясьпек і нявыгод. Адным словам, там былі дарогі такія, якія і дагэтуль у нашым Палесьсі і Жамойці“. І далей аўтар апісвае няхітрую пабудову Кацярынінскага шляху. Адсталы, у вялікай меры натуральны ўклад гаспадарчага жыцьця доўгі час задавальняў шляхту, але, прыблізна каля часу эпохі падзелаў, экономічнае зьбядненьне краіны, яе адсталасьць пачынаюць у сільнейшай меры непакоіць польскае і літоўска-беларускае грамадзянства. Аўтары таго часу пачалі разумець, што знадворны гандаль фактычна знаходзіцца ў руках чужаземцаў. Захапленьне чужаземнымі таварамі, і значыцца, патрэба набываць іх за хлеб, лён і пяньку даводзяць да роспачы такіх патрыётаў, як Сташыц і іншыя. Убогі хлоп, стомлены бязупыннаю працай без усялякіх патрэб, зьвязаных з рынкам, пачынаў калоць вочы. Марнатраўства панскага двара, маса слуг,— усе гэтыя зьявішчы пачалі адчыняць вочы прадстаўніком польскае і беларускае інтэлігенцыі. Пагрозы політычнага жыцьця будзілі нацыянальныя пачуцьці. Але гэтыя рысы новых паняцьцяў у канцы канцоў грунтаваліся на вельмі прыкметным зьбядненьні вышэйшае клясы, шляхоцтва. Нават вялізарныя маёмасьці магнатаў ня вытрымлівалі пышнасьці, якая панавала. Зьбядненьне шляхты кідалася ў вочы. Адна частка яе, каб палепшыць свае справы, прадавала інтарэсы дзяржавы, але другая пачынала разумець, што корань зла знаходзіцца ў экономічным базісе і што барацьба з зьбядненьнем павінна выяўляцца ў уздыме гаспадаркі. Гэта была думка правільная, але ў політычных адносінах безнадзейная. Адсюль ажыўленьне тагачаснае літаратуры, адсюль імкненьне да зьмены гаспадарчых формаў.

Запраўды, напярэдадні эпохі падзелаў мы наглядаем шэраг мерапрыемстваў, якія павінны былі дапамагчы ўзмацненьню гандлю, росту прамысловасьці і зьмяншэньню клясавых супярэчнасьцяй.

Найранейшаю думкай зьяўляецца думка аб паляпшэньні шляхоў, і перш за ўсё ў імшарыстым Палесьсі. Паміж 1778 і 1784 гадамі, дзякуючы энэргіі Мацея Бутрымовіча (пазьней пасла на 4-летні сойм), мясцовыя зямляўласьнікі будуюць два добра ўпарадкаваныя шляхі: адзін ад Слоніму да Пінску праз Лагішын, а другі з Пінску на Валынь. Першым шляхам Вільня і Менск выгодна злучаліся з Берасьцем і Варшавай. Сродкі на гэтыя шляхі былі дадзены галоўным

чынам славутым гэтманам Агінскім. Далей, нарадзіліся і былі зьдзейсьнены думкі аб злучэньні галоўных рэк каналамі. Першым быў пракапаны Агінскі канал, які злучыў Шчару з Яцольдай і, значыцца, Дняпро з Нёмнам. У 1784 годзе прайшоў першы транспорт суднаў ад Херсону да Краляўца. Канал быў пабудаваны коштам таго-ж Агінскага. Ён-жа прабаваў правесьці яшчэ адзін канал пад Сьцятычавам, а Скірмунт—каналізаваць Пінскія балоты між Гаравахай і Веляцічамі. Вучоны ксёндз Францішак Нарвойт працуе над абчышчэньнем Нёмну, на працягу трох год, згодна даручэньню літоўскае скарбовае камісіі. Ужо ў эпоху падзелаў быў скончаны Дняпроўска-Бугскі канал, які злучыў Піну з Мухаўцом, утокам Бугу. У 1784 годзе памянёны Мацей Бутрымовіч лёгка правёў па гэтым шляху, яшчэ ня зусім тады гатовым, першыя 10 суднаў у Варшаву і Гданск. Канчаткова канал быў гатовы толькі ў пачатку XIX сталецьця. Каля таго-ж часу зьяўляюцца проекты злучэньня Дняпра з Дзьвіною. Славуты вучоны Тадэуш Чацкі ў 1796 годзе, ґ. зн. ужо пасьля падзелаў, падаў мэморыял аб карыснасьці гэтага каналу. Ён адзначае, што былая Менская губэрня ў раёне ракі Бярозы адрэзана ад Дзьвіны. Дзеля гэтага транспорт лясных матар'ялаў каштуе вельмі дорага і адбірае шмат часу.

Гэтым была пасунута наперад будоўля Бярэзінскага каналу, які быў скончаны расійскім урадам значна пазьней. Тады-ж зьяўляецца цэлы шэраг іншых проектаў аб злучэньні каналамі паўднёвых рэк з Нёмнам і нават з Ільменем.

Асабліва цікавы спробы аднаўленьня некаторых галін прамысловасьці. Толькі цяпер, у эпоху спаду дзяржавы і яе экономічнага зруйнаваньня, да Беларусі дайшлі ідэі мэркантылізму, і пачалася эпоха штучнага насаджэньня прамысловасьці альбо пасуваньня наперад яе ранейшых пачаткаў. Гэтае зьявішча ўласьцівае ўсёй аб'яднанай дзяржаве. Каля таго-ж часу ў Польшчы зьяўляюцца спробы ўтварэньня некаторых акцыянэрных кампаній і насаджэньня прамысловасьці з дапамогаю чужаземных капіталістых.

На чале прадпрыемстваў стаіць шляхта. Гэта ёсьць справа ня столькі капіталу, колькі інтэлігентнае шляхты, а загэтым і самыя прадпрыемствы будуюцца ня досыць практычна і не зьяўляюцца досыць моцнымі. Значную ролю ў гытым аднаўленьні прамысловасьцы адыграла Беларусь.

У справе разьвіцьця прамысловасьці энэргічную дзейнасьць тут разьвінуў падскарбі надворны літоўскі Антоні Тызэнгаўзэн, якога падбухторваў да дзейнасьці кароль Станіслаў-Аўгуст. Ён атрымаў у арэнду ад караля надзвы-

чайна багатую Горадзенскую экономію і паставіў сабе за мэту—падняць Горадню і зрабіць з яе прамысловы асяродак.

Мы ўжо ведаем, што зьяўленьне ў гэтых мясцовасьцях суконных фабрык не магло быць выпадковасьцю, бо гэтая частка Палесься выдзялялася разьвіцьцём аўчарства.

Багатыя сродкі Горадзенскае экономіі шмат палегчылі задачу Тызэнгаўзэна. Трэба заўважыць, што па сваім характары гэты магнат быў крыху фантазёрам, але аднычасна вызначаўся вялізарнай энэргіяй і здольнасьцю да вельмі match рознастайнае дзейнасьці. Ён меў друкарні ў Вільні і ў Горадні, выдаваў Горадзенскую газэту, выдаваў кнігі, заснаваў некалькі школ і нават ботанічны сад.

У маёнтках, якімі ён кіраваў, ён імкнуўся падняць прамысловасьць, асабліва лясную справу, і ў розных сваіх маёнтках і стараствах заснаваў шэраг фабрык: у Паставах палатняную фабрыку, гэткую-ж у Шаўлях, у Берасьці—суконную фабрыку. Але гэта былі вельмі бедныя заклады. Толькі навокал Горадні ў 1777 годзе такіх дробных фабрычных закладаў лічылася 15. Усё гэта былі спробы падняць розныя формы прамысловасьці. У 1780 годзе былі ўжо 23 розныя фабрыкі. Найбуйнейшай сярод іх была фабрыка шаўковых вырабаў, якая налічвала 62 варштаты. З ліку апошніх 24 былі спэцыяльна прызначаны для вырабу залатаканых паясоў. Фабрыкай загадвалі французы. Суконная фабрыка мела 24 варштаты. Далей, сярод фабрык Тызэнгаўзэна была фабрыка залатых вырабаў, сталовае бялізны, панчошная, анталяжная, экіпажная, картачная. Прадмесьце Горадні—Гарадніца зусім зьмяніла свой выгляд: у ёй зьявіліся вуліцы з добрымі мураванымі і драўлянымі будынкамі. Аколічныя сёлы таксама былі прыцягнуты да працы.

Выдумкі Тызэнгаўзэна былі тыпова панскія. Ён выпісваў чужаземных майстроў для навучаньня падданых сялян.

Была спроба нават утварыць рабочую клясу, дзеля чаго былі ўзяты прымусова з падданых сямей хлопчыкі і дзяўчынкі і аддадзены ў навучаньне рамяству. Тызэнгаўзэн нават у школы гвалтам зганяў подданых сялян і прымушаў іх вучыцца мэдыцыне і хірургіі.

Ангельскі падарожнік Кокс апавядае, што ў прадпрыемствах Тызэнгаўзэна было каля 3.000 рабочых, у тым ліку і тыя, хто па вёсках былі заняты прадзеньнем воўны і льну. Але той-жа Кокс падрабязна спыняецца на становішчы падданых рабочых на фабрыцы. Яму жаліліся дырэктары, што хаця фабрычныя рабочыя атрымліваюць лепшае адзеньне і харчы, чымся іншыя сяляне, аднак, іх немагчыма прыцягнуць да заняткаў промысламі інакш, як толькі гвалтам. Кокс вельмі добра зразумеў, што гэта адбываецца так

з прычыны рабскага стану рабочых: „Большасьць сярод іх мела на сваім твары выраз такога глыбокага суму, што маё сэрца балела, калі я глядзеў на іх. Лёгка было зразумець, што яны працавалі з прымусу, а ня з уласнага жаданьня“.

Тызэнгаўзэн быў натурай схільнай да захапленьня і мастацкай. Гэта быў дылетант, які цікавіўся ўсім і ня меў дакладна азначаных вед. Ён усё пачынаў, але ня ўмеў чакаць канца, браўся за ўсё, як мэцэнат. Ня дзіва, што ў канцы канцоў прадпрыемства Тызэнгаўзэна трэснула, і справа скончылася мільённым дэфіцытам.

Тызэнгаўзэн быў найбуйнейшым зьявішчам у пэўных адносінах, але далёка не адзіным. Апошні падканцлер Літвы граф Яхім Храбтовіч у 1790 годзе будуе ў сваім маёнтку, Вішневе, першую і адзіную на Баларусі, доменную печ. Але гэтая выдумка існавала ўсяго 4 гады. Канцлер літоўскі Сапега ў сваім маёнтку, Ражаньне (у Слонімскім павеце), будуе суконную, папяровую і палатняную фабрыку, а яго брат Казімер у Кодні—суконную. Княгіня Ганна Ябланоўская ў Сямяцічах (на Падляхіі) утварае салетраны майдан і казанную. Хаця гэтыя спробы былі няўдалыя, але ўсё-ж такі яны не прайшлі бясьсьледна, як, напрыклад, спроба Тызэнгаўзэна, бо з бегам часу Горадзенскі раён і запраўды зрабіўся фабрычным раёнам.

У гэтую-ж эпоху некаторыя вельмі невялічкія спробы ранейшага часу набываюць асаблівае протэктарства з боку беларускіх магнатаў. Так, княгіня Ганна Радзівіл, як відаць, яшчэ ў першай палове XVIII сталецьця, пабудавала ў сваіх маёнтках некалькі фабрык. У Налібоках яна заснавала шкляны завод, у Яновічах—фабрыку шліфаваных каменьняў, ва Ўрэччы—шкляны завод і фабрыку люстэрак, у Смолкаве фабрыку гліняных вырабаў, у Карэлічах шпалерную. У тых-жа Радзівілаў у Несьвіжы здаўна існавала дывановая фабрыка і вельмі вядомая фабрыка ўсходніх вырабаў у Слуцку.

Слуцак, як мы ўжо ведаем, здаўна быў даволі прамысловым гарадком. Гэта быў асяродак прамысловасьці і мастацтва. Тут славуты Г. Лейбовіч, родам з Несьвіжу, пісаў сваю галярэю Радзівілаўскіх портрэтаў. Княгіня Урсуля-Францішка Радзівіл, раджоная Вішнявецкая, жонка князя Міхала, якога празвалі „рыбенок“, была вялікаю протэктаркай усялякага роду артыстычных талентаў. З гэтага скарыстаў нейкі Ян Маджарскі, армянін родам з Стамбулу, і з дапамогай Радзівілаў заснаваў у Несьвіжы фабрыку гобэленаў. Потым ён зьяўляецца ў Слуцку і робіць з князем Радзівілам умову адносна выпрацоўкі паясоў і іншых золата- і срэбратканых вырабаў пэрскае працы. Пры гэтым Ма-

джарскі абавязуецца навучыць гэтай працы аднаго майстра. У канцы XVIII сталецьця на фабрыцы былі 24 варштаты, а ў пачатку XIX сталецьця толькі 12 з 30-ма рабочымі. На фабрыцы рабіліся match розныя матэрыі ў пэрскім гусьце. Цікава, што фабрычны штэмпэль пісаўся пабеларуску „Лео Маджарскі“.

Але ўсе гэтыя спробы насаджэньня прамысловасьці былі ня болей, як панскія выдумкі, пад якімі часам хаваўся добры замер альбо перайманьне Захаду, але ня было здаровага разуменьня рэальнае рачавістасьці. Апроч суконных, ільняных і шкляных фабрык, усе іншыя мелі на мэце задаволіць утончаныя густы вяльможных паноў і грунтаваліся на падвозе чужаземнае сыравіны. Ня было разуменьня таго, што рамёствы і фабрыкі першага роду выпрацоўваюцца дзесяцігодзьдзямі, а фабрыкі, якія грунтуюцца на мясцовай сыравіне, павінны мець перш за ўсё мясцовы рынак для збыту.

Апроч таго, гэтыя спробы ў пераважнай большасьці робяцца якраз тады, калі Рэч Паспалітая ў гандлёвых адносінах накіроўвалася сваймі суседзямі. Так, мары аб каналах, якія вядуць з паўднёвае Беларусі да вусьця Віслы, паўсталі ў тую эпоху, калі кароль Прускі Фрыдрых Вялікі сыстэматычна падкопваў польскі і беларускі гандаль, жадаючы ўладаць Гданскам. Ён утвараў мытныя каморы, якія парушалі вольнасьці Гданскага порту і ў той-жа час ненатуральна падвышалі кошт вывазных тавараў. Ён дайшоў нават да таго, што выбіў два мільёны фальшывых талераў, якія распаўсюдзіў па Польшчы і Літве. Дагавор з Прусіяй 1775 году відавочна імкнуўся накіраваць польскі гандаль згодна прускіх інтарэсаў. Толькі пераход Гданску ў рукі Прусіі дапамог уздыму яго гандлю, г. зн. павялічэньню наплыву польскіх-жа тавараў.

Гандаль з Аўстрыяй у эпоху падзелаў ня меў вялікага значэньня, бо Польшча нічога ня вывозіла ў апошнюю, а да сябе ўвозіла толькі пераважна вэнгерскае віно. Зносіны з Прычорнамор‘ем спыніліся яшчэ ў XVII сталецьці, калі Турцыя захапіла цытадэлі на паўночным беразе Чорнага мора. Але паўднёвы кірунак гандлю адразу-ж набыў вялікае значэньне, калі Прычорнамор‘е перайшло ў рукі Расіі. Трэба заўважыць, што гандлёвы трактат 1775 году, г. зн. зараз-жа пасьля першага падзелу, быў вельмі спагадны для Польшчы. Расійскі ўрад вельмі прадбачліва ўвёў шэраг ільготных артыкулаў для тае часткі Беларусі, якая яшчэ заставалася ў злучэньні з Польшчай.

Гэтыя артыкулы абвяшчалі вольны гандаль па Дзьвіне. Рыскі гандаль сольлю звольнены быў ад усялякіх мытных

збораў і монополіі. Нарэшце, Рыскі порт наогул абвешчаны быў у васабліва прывілейным становішчы.

З другога боку, захват Расіяй паўднёвых стэпаў і зьяўленьне расійскае гандлёвае флёты ў Дарданэлах вельмі ажывіла польскі гандаль, адцягнуўшы частку яго тавараў на поўдзень, што мела значэньне для ўздыму гандлю былое Рэчы Паспалітае.

Гандаль Віцебску хутка падняўся. Калі ў палове XVIII сталецьця лік суднаў, якія прыходзілі ў Рыгу за таварам, быў ад 300 да 600, дык з 70-х гадоў ён хутка ўзрастае, і на рубяжы XVIII і XIX сталецьцяў Рыскі порт прымае ў свае воды каля 1.000 суднаў у год. Зразумела, тут ужо была частка і расійскіх тавараў, але на долю Беларусі выпадала найвялікшая частка іх.

Беларускія гандляры хутка асвоіліся з новым пашырэньнем рынку, і ўжо ў апошнія гады XVIII сталецьця і ў першыя гады XIX Віцебск знаходзіцца ў шырокіх гандлёвых зносінах са Смаленскам, Харкавам, Пецярбургам, Масквой, Варонежам, Хэрсонам, Якабштадтам, Ліпецкам і інш. Гэтыя зносіны, між іншым, адзначаюцца шырокім крэдытам, якім карысталіся віцебскія гандляры ў гэтых местах. Па захаваўшыхся запісах протэставаных вэксаляў можна бачыць, што, напрыклад, у 1801 годзе было протэставана на 245 тысяч рублёў вэксаляў, выдадзеных у Віцебску. Ва ўмовах прымаюць удзел, галоўным чынам, гандляры і мяшчане і вельмі рэдка шляхта. Нават 10% гадавых, звычайных у тыя часы, можна лічыць нявысокім процантам, які паказвае, што крэдыт быў частым зьявішчам.

Гэткім чынам здавалася, што новая палітычная сітуацыя абяцае лепшыя ўмовы для гаспадарчага жыцьця краіны. Праўда, пры канцы Рэчы Паспалітае і ў шляхоцкіх галовах пачалі нараджацца ідэі такой экономічнай і соцыяльнай палітыкі, якая крыху палегчыла-б становішча ніжэйшых кляс і зрабіла-б іхнюю працу болей продукцыйнай у гаспадарчых адносінах. Чатырохлетні сойм ня выявіў асаблівага лібэралізму, але ўсё-ж у гэтую эпоху наглядаецца значна большае як раней разуменьне запраўднага стану рэчаў.